Мікола Касьцюкевіч

# Вяртаньне

## Вершы

KAMUNIKAT.org

Менск
друкарня
К. Пянткоўскага
1990

KAMUNKAT.org

* * *

Мару светлую юнацтва
я захоўваю ў душы:
цераз вершы і мастацтва
недзе ў будучым ажыць,

перадаўшы не аблічча
у карцінах і радках
а суплёты дум нязвычных,
і... патужніка спаткаць.

*1987*

KAMUNIKAT.org

* * *

Заплюшчыла шэрыя вочы
ад прыцемку сумнага ноч.
Ці непагадзь хто напрарочыў?
Жыццё — як у шклянцы віно.

Сціскаюцца кольцы, скуголіць
чырвоным спавітая бель.
Да рання магутная воля
схавала пад снегам сябе.

*1987*

KAMUNIKAT.org

* * *

Пагода лістотай у шыбу шпурнула
і жоўтую зграю пагнала між дрэў.
Пад золкім туманам прысады паснулі,
вятрыска шалёны ад волі здурэў.

Згубіў я калісьці бяздумна жанчыну
між хваляў шумлівай жыццёвай ракі,
а зараз імкнуся з вірлівае плыні
без сіл дацягнуцца да нейчай рукі.

*1987*

* * *

О першае наша спатканне —
да неба падскочыць гатоў!
І музыка дзіўная слоў…
І схоплена раптам дыханне…

Іду праз гады, як падлетак,
забыўся на сон і спакой,
і прагну адзінай такой
дарыць безліч лета і кветак.

……………………………………………
На момант уздым прыгажосці
у зале шматлюднай заціх…
І я выбіраю з усіх
дзяўчыну сваёй маладосці.

*1987*

* * *

Блакітнае неба ляжыць, нібы поле,
авечкі-аблокі брыдуць сабе ціха.
Крыху пасвяжэла і дожджык паволі
агністай вясёлкаю цёпла задыхаў.

Ляніва каровы ў траву пазяхаюць,
на ўзгорку пастух пажылы прымасціўся,
зрабіў самакрутку і ціха спявае
пра волю былую у гэтых мясцінах.

*Сакавік 1988*

* * *

У народа ёсць прыкмета
для няўрымслівай душы:
як пачне адходзіць лета,
ты жаданне напішы
на апошні ліст зялёны
і на вецер ліст пусці...
І любы хаўрус трызнёны
мусіць у нябыт ісці.
Напішу і я што помню,
што даўно ў душу лаўлю,
пакуль сонечныя промні
грэюць стомлена зямлю.
Восень ліст умомант сточыць
яшчэ тут, каля пляча —
і тады пабачаць вочы
новы, вынайдзены час.

*1989*

## АКРАВЕРШ

**А** ў парку долу пападала лісце,
**Н**ейкі вар’яцка-прыгожы абшар.
**Ж**оўтага суму салодкае выйсце:
**А**панавала дзве ноты душа.
**Л**ёгка між дрэваў брысці ў асалодзе
**І** забывацца штораз пра сябе.
**Н**ават дажджынкі ў нябыт адыходзяць,
**Е**нкам заходзячыся ў журбе.

*3 кастрычніка 1989*

KAMUNIKAT.org

* * *

Трымаюць з даўнае пары
каханне, любасць і сябры.

Я адчуваю часу смак,
таму й сачу яго няўзнак.

Дае цяпло бацькоўскі дом,
і небыццё ідзе на злом,

а з рук маіх, не знаць куды,
нібыта птушкі, мкнуць гады.

*1989*

* * *

Людзі ў сталасці рэдка нясуць
каляровых пачуццяў насенне
і спакойна мінаюць расу,
што лягла, як пярсцёнак вясельны,
на танюсенькі палец травы.

Я ў дзяцінстве не мог прычакаць
вечаровай дзівоснае цені,
а цяпер казкі ўкладіся спаць —
мо' таму, што згубіў прасвятленне,
ці зрабіўся зусім нежывы.

*1989*

KAMUNIKAT.org

* * *

Размыліся кахання рысы,
адно я помню з даўных дзён:
як ты пайшла, дагэтуль прысак
ад дому нашага відзён.

Але выпадак нам спрыяе
і аджывае з небыцця,
як здань, як дзіўны сон на яве
наканаванасці працяг.

KAMUNIKAT.org

* * *

— Мой Бог! Нашто ў дадатак церні
на й без таго суровы лёс?!
Але… ні гуку ў ночнай цемні,
дзе ў кожнага сваё мігценне
ліхтарні срэбнае нябёс.

KAMUNIKAT.org

## ЗНАК БЯДЫ

> Покуль сонца ўзыдзе
> Раса выесць вочы
>
> *Ян Чачот*

Птушыны клёкат заглушалі
і трапна цэлілі з рукі,
то браканьеры-цемрашалы,
то проста злыя дзецюкі.

Для тых злачынцаў жыр і роздых,
калі прыходзіць ноч у дом —
і паміралі птушкі ў гнёздах
ушчэнт папаленых агнём.

Зноў у чаканні мы мадзеем —
а мо' загоіцца крыло?
Яшчэ дагэтуль ёсць надзея,
хоць сонца так і не ўзышло.

*Лістапад 1989*

* * *

Не людзі — адлюдкі кіруюць народам,
аджыўшы сваё — паўстагоддзе таму.
Яшчэ ці апошняя подлая згода
абраных, найлепшых закіне ў турму!

А косці сяброў палеглі у магілах,
і толькі пакінулі боль па сабе.
Мо' хутка і нашы абломяцца крылы?
Пад небам айчыны брыдзем у журбе.

*3 кастрычніка 1989*

## ТАНКІ

Траву з тратуарамі тракамі душаць,
абапал маўклівыя людзі стаяць.
Адно што жаданне варушыцца ў душах
на мірную працу жалеззе забраць.

Разносіцца грукат матораў і сталі,
магутны паўзе паўз людзей карагод.
...Як шчыра садаты калісьці спявалі:
«Мы выйшлі з народу і з намі народ».

*Лістапад 1988*

KAMUNIKAT.org

## ГАТЫЧНЫ ТРЫЯЛЕТ
Эсэнцыя

Страхі людскія, як птахі,
вострыя ў іх кіпцюры.
Нельга услых гаварыць:
страхі людскія, як птахі.

Ночныя крылаў узмахі
недзе ўжо блізка ўгары —
страхі людскія, як птахі,
востраць свае кіпцюры.

KAMUNIKAT.org

* * *

Калі здараецца хвіліна
і трэба нам выракаваць,
якую выбраць пуцявіну,
каб потым сораму не знаць

каб зноў з душою лёгкай крочыць,
ёсць спосаб слушны: кожны раз
глядзецца ў матчыныя вочы,
што дзесь' пакутуюць за нас.

KAMUNIKAT.org

* * *

Так, я радкі свае павінен
пісаць уласнаю крывёй,
на мне, я ведаю, правіна
і цяжар грэшнасці людской.

А дух тады ў пакутах кіне
хадзіць па вастрыі ляза,
калі сцячэ па дамавіне
зямлі апошняя сляза.



KAMUNIKAT.org

* * *

Вялізным венікам зімы
ачышчана зямля.
Цяпла чакае, як і мы
замерзлая ралля.

А толькі сонцам веснавым
прагрэецца абшар —
прачнецца поле, тады ў ім
абудзіцца душа.

*1989*

KAMUNIKAT.org

## РАМАНС

Ён ніколі ўжо болей не прыйдзе,
не адорыць усмешкай мяне,
дык гарыце, дзянёчкі, гарыце,
хай бясконцая ноч ахіне.

Ён ніколі не прыйдзе ўжо болей,
я дап'ю гэты кубак да дна
і з сябрамі, шкадуючы болю,
насмяюся, паплачу — адна.

Ён не прыйдзе ўжо болей ніколі,
а таму я хачу ўсё забыць,
бо душы той любові даволі
і не можа яна не любіць.

*1989*

KAMUNIKAT.org

* * *

Я сэрцам высвеціў мінулае,
усё, чым ты раней жыла.
Каб здрада ў вір нас не звяла,
я сэрцам высвеціў мінулае.

Але вакол няма цяпла —
сляпая рэўнасць тне і муляе,
бо сэрцам высвеціў мінулае,
усё, чым ты раней жыла.

*1989*

KAMUNIKAT.org

* * *

Каб не пісаць жыццё нанова,
калі ўжо нельга далей жыць,
спачатку проста дастаткова
дзесятак дрэваў пасадзіць —

так пачынаюцца ўсе справы,
што маюць славаю грымець...
Мільгне над намі тая слава,
а дрэвы будуць зелянець.

*1989*

KAMUNIKAT.org

## БАНАЛЬНЫЯ СТАНСЫ

Нават па-над морам,
дзе іх невымерна,
не дастанеш зоры
без праўдзівай веры.

Лепей за сустрэчу
вечнае каханне,
бо яно пярэчыць
болю развітання.

Выпадковым словам
усё згадаць магчыма,
апрача любові,
маці і Айчыны.

KAMUNIKAT.org

* * *

*У. Караткевічу*

У роспач ладдзя адплывае,
туман ахінае карму.
Нібыта па сэрцу майму
у роспач ладдзя адплывае.

І хто нам адкажа, чаму
у нашым жыцці так бывае:
у роспач ладдзя адплывае,
туман ахінае карму.

*1990*

KAMUNIKAT.org

## ГАЛОСНАСЦЬ

Бо людзі не ў згодзе,
квітнее ў народзе
без вінаў правіна.
І ветласць тут гіне,
калі бездухоўнасць
ашчэрыцца поўняй,
як чэрап з-за кратаў.
А псы-бюракраты
выходзяць на ловы.
І шчырае слова
знікае імгненна
ў агні сутыкнення.

*1989*

KAMUNIKAT.org

* * *

Таемнасць хларафіла
прасочвае салата.
За танкамі спачылі
ружовыя салдаты.

І немаўля з калыскі
аплёўвае плакаты,
дзе скурчылася пыса
чырвоная, вусатая.

Рука сціскае цвёрда
музейную рыдлёўку.
Паўзе змяёй бікфорднай
сельгасартпадрыхтоўка.

*1991*